*А. І. Бабко,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат філасофскіх навук*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ І ЯЕ РОЛЯ Ў ДУХОЎНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нацыянальная ідэя кожнага народа выступае як своеасаблівае ядро яго культуры. Здзяйсняецца яна і ў індывідуальным жыцці ўсіх тых, хто да гэтага народа належыць, выступаючы як фактар кансалідацыі, адзінства. У сённяшнім свеце, у якім самастойнасць, годнасць і права асобы ставяцца надзвычай высока, гэта можа быць грунтам для трывожных сумненняў: ці не хаваецца тут магчымасць таталітарызму, абмежавання свабоды і незалежнасці індывіда, жорсткіх, прымусовых метадаў арганізацыі сацыяльнага жыцця? Падобная магчымасць мае месца, але яна звязана толькі са злоўжываннем нацыянальнай ідэяй, са скажонымі, неадэкватнымі формамі яе рэалізацыі. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што негатыўны, «дыялектычны» момант заўжды прысутнічае ў працэсе яе здзяйснення: калізіі, праблемы і супярэчнасці ў ім непазбежныя (як непазбежныя яны і пры рэалізацыі высокага агульначалавечага ідэалу – ідэалу праўды, дабра і прыгажосці).

Надзвычай супярэчлівым і няпростым згаданае з’яўляецца ў выпадку беларускага народа, што хвалявала і хвалюе ўсіх тых, каму неабыякавы яго лёс. Высвятленне прычын такой сітуацыі належыць да ключавых праблем у абсягу беларускага нацыянальнага дыскурсу. (Узгадаем у дадзенай сувязі бліскучае эсэ Ігната Абдзіраловіча «Адвечным шляхам», у якім смутныя, няпэўныя абрысы нашай культуры разглядаюцца як вынік вялікай гістарычнай трагедыі, якую мусіў перажыць беларускі народ [1, с. 8]). Пры гэтым выбітныя яго прадстаўнікі імкнуліся да яе кардынальнага змянення, да ўсё больш поўнага і арганічнага ўвасаблення нацыянальнай ідэі ў духоўным жыцці нашага народа і ў сваім уласным жыцці і творчасці.

Якім моцным і шчырым магло быць такое памкненне, паказвае прыклад Алеся Гаруна. Яго жыццё сапраўды прасякнута нацыянальнай ідэяй беларускага народа, ён зрабіў мэты яго барацьбы сваімі асабістымі мэтамі, ён жыў імі: паэт належаў да тых

у вышэйшай ступені шчаслівых людзей, якім дадзена цалкам аддаваць сябе сваёй справе, свайму прызначэнню, сваёй мары. Якім гарачым было яго памкненне да агульначалавечага, да свабоды і шчасця ўсіх людзей, гэткайсама шчырай і няўрымслівай была яго любоў да Беларусі («нацыянальны эрас», паводле трапнага выразу Антона Адамовіча [2, с. 1085]). Ён быў прасякнуты няўтольнаю прагай працы дзеля разняволення нашага народа, дзеля абуджэння яго нацыянальнай самасвядомасці, дзеля развіцця ягонай культуры. І ён працаваў, працаваў на самых розных кірунках, працаваў нястомна, не шкадуючы сябе [2, с. 1077–1080].

Паэт не цешыў сябе ніякімі ілюзіямі адносна цяжкасцей на шляху да самаздзяйснення беларускага народа як нацыі са сваёй уласнай дзяржаўнасцю, з высокаразвітай адукацыяй, эканомікай і культурай (менавіта ў такім парадку гэтыя духоўныя сферы паставіў сам паэт [4, с. 382]). Нават у 1917–1918 гг., калі згаданая задача пачала набываць практычны характар, гэтыя цяжкасці заставаліся неймавернымі. Надта марудна і няпроста ішоў працэс разняволення і нацыянальнага самавызначэння народа. Паэт указвае: «“Сацыялістычную” рэвалюцыю Беларусь спаткала, не маючы моцнага, добра арганізаванага меськага пралетарыяту, з адным цёмным, забітым многавяковым гнётам з боку чужынцаў сялянствам» [4, с. 352]. Адукаваныя станы таксама не маглі выступіць як апірышча для рэалізацыі нацыянальнай ідэі, бо яны «не былі народнымі: шляхоцкая часць, будучы «польскай», пагарджала «халопствам», яго баялася і не любіла, а так званыя «разначынцы», дастаўляўшыя, галоўным чынам, працаўнікоў ва ўсякія расійскія канцыляры, прапіталіся наскрозь духам расійскага бюракратызму і не аказаліся здольнымі да творчасці» [4, с. 352]. Алесь Гарун, аднак, не лічыў гэтыя цяжкасці неадольнымі. Яны ні ў якім разе не паралізавалі ягоную волю да змагання і – ён верыў у гэта – не маглі паралізаваць волю народа. Галоўнае – паэт цудоўна ведаў, што трэба рабіць: «Найперш трэба пакінуць гультайства. Потым трэба любіць сваю Бацькаўшчыну. Потым узяцца за спаўненне сваіх абавязкаў. Ідзі і рабі тое, да чаго цябе вучылі. І помні заўсёды, што ты робіш гэта дзеля Бацькаўшчыны. А таму – рабі добра» [4, с. 383]. (Тут мы маем лаканічную фармулёўку асноўных прынцыпаў канцэпцыі захавання і развіцця нашай нацыянальнай культуры, безумоўна актуальную і зараз.)

У постаці Алеся Гаруна надта выразна адбіваецца аспект трагізму ў гістарычным лёсе нашага народа. Тое, што паэт здолеў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зрабіць за свой нядоўгі век і ў цяжкіх варунках, у якіх ён жыў, нельга не ацаніць як сапраўдны подзвіг. Але што мелі б мы, калі б лёс спрыяў гэтаму чалавеку? Жыццё і творчасць Алеся Гаруна належыць да тых набыткаў беларускага народа, на якія ён можа заўжды абаперціся ў сваім змаганні за культуру, за мову, за будучыню.

Такім чынам, беларусы здолелі стварыць нацыянальную духоўную традыцыю, а ў яе рамках – нацыянальную інтэлігенцыю, нацыянальную эліту. І гэта сведчыць пра высокі духоўны патэнцыял беларускага народа, пра яго духоўную сілу. Таму ёсць усе падставы пагадзіцца з высновай Ігната Абдзіраловіча, паводле якой у знешняй неакрэсленасці, невыразнасці нашага гістарычнага шляху і нашай нацыянальнай самаідэнтыфікацыі нельга бачыць няздольнасці беларускай нацыі «ўласным крокам ісьці да вытварэньня ўласных формаў жыцьця» [1, с. 8].

І сапраўды, калі М.Хайдэгер указваў на прыярытэт магчымасці ў чалавечым існаванні ў свеце – магчымасці як здольнасці зрэалізаваць сябе ў ім [6, с. 41–43], дык гэта мае моц і ў дачыненні да быцця народа, які таксама выступае як магчымасць самога сябе, як скіраваны ў будучыню праект. Наяўнасць нацыянальнай традыцыі і нацыянальнай эліты з'яўляецца грунтоўнай перадумовай паспяховасці дадзенага праекта. І гэта цудоўна разумелі выбітныя беларускія дзеячы, якія заклікалі нацыянальную інтэлігенцыю «стаць бліжэй да душы роднага народа, лепі паталіць яе духоўную смагу і сапраўды ўзяцца за вялікую працу: развіццё беларускай культуры» [3, с. 288].

Падаецца, неправамерна гаварыць пра абыякавасць народа да беларускай ідэі. У глыбінях свайго духу ён хавае адданасць ёй, адданасць нацыянальным каштоўнасцям. Інакш вельмі цяжка растлумачыць, чаму ён здолеў захаваць сябе ў такіх да трагізму складаных умовах. Гэта азначае, аднак, што неправамерна весці гаворку і пра «элітарны» характар беларускай нацыянальнай ідэі.

Гарачае памкненне да яе ўвасаблення ў жыцці нашага народа і ў сваім індывідуальным жыцці, характэрнае для лепшых яго прадстаўнікоў, спалучаецца (інакш і не можа быць) з іх памкненнем выявіць, раскрыць яе ў тэарэтычным плане, што таксама выступае як грунтоўны аспект яе рэалізацыі. Пры гэтым трэба разумець, што яна не можа быць зведзена да некалькіх кідкіх вербальных формул. Нацыянальная ідэя ўяўляе сабой у гэтым плане складанае тэарэтычнае ўтварэнне, ядром якога – дзе яна фармулюецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

найбольш адэкватна і грунтоўна – з’яўляецца нацыянальная філасофская традыцыя. Каб зразумець яе сутнасць, неабходна таксама мець на ўвазе, што яна выступае як своеасаблівы сінтэз універсальнага, агульначалавечага і адметнага, нацыянальнага. Таму для паўнавартаснага яе здзяйснення народ павінен усвядоміць сябе, з аднаго боку, носьбітам агульначалавечых ідэалаў і прынцыпаў, а з другога – самастойнай і адметнай супольнасцю, гэта значыць народам.

Важнай і цікавай у дадзеным кантэксце падаецца распрацоўка паняцця народа Гегелем. Сутнасць гэтага феномена ні ў якім разе не можа быць адэкватна выяўлена ў такіх тэрмінах, як «маса», «натоўп» і да т.п. Гегель вызначае яго як «народны дух», ён выступае ў філосафа як «канкрэтная ідэя» [5, с. 374]. Але, паводле Гегеля, кожнаму духоўнаму ўтварэнню ўласціва ўсведамляць, ведаць, разумець сябе [5, с. 431]. Таму момант самаўсведамлення з’яўляецца таксама неад’емнай характарыстыкай народнага духу. Неабходна адзначыць, што ў беларускай культурнай прасторы выказваліся думкі, сугучныя гегелеўскім. Так, Янка Купала гаворыць пра беларусаў як пра грамаду, і грамада – гэта зусім не натоўп чэрні, а з’ядналая высокай мэтай («людзьмі звацца») супольнасць. І хоць наперадзе яе чакаў (і чакае) няпросты шлях да свайго глыбокага і адэкватнага самаўсведамлення, першыя крокі ў гэтым кірунку ўжо былі зроблены і былі дасягнуты першыя вынікі.

Без высокай мэты, без сваёй ідэі, без сваёй вялікай мары (сутнасць якой – у разняволеным, незалежным і творчым існаванні) беларусы не зрабіліся б нацыяй. Без іх яны не здолеюць захаваць сябе у складаных варунках, выкліканых да жыцця глабалізацыйнымі працэсамі. Пры ўсіх супярэчнасцях і складанасцях у здзяйсненні сваёй нацыянальнай ідэі наш народ назапасіў досвед гэтага здзяйснення ў самых неспрыяльных гістарычных умовах. Ён здолеў стварыць сваю нацыянальную духоўную традыцыю, а ў яе рамках – нацыянальную эліту. І дадзеная традыцыя аднаўлялася, ажывала нават пасля смяротных, здавалася б, удараў. Сам гэты факт сведчыць пра духоўную сілу беларускага народа. Таму цалкам неправамерна гаварыць пра абыякавасць яго да сваёй ідэі. Неправамерна гаварыць і пра чыста «элітарны» яе характар, бо нацыянальную эліту нельга адасабляць ад народа, які яе спарадзіў. Той момант, аднак, што здзяйсненне беларускай нацыянальнай ідэі сутыкаецца з грунтоўнымі цяжкасцямі (значна больш сур’ёзнымі, чым у многіх іншых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народаў), павінен успрымацца не як падстава для адчаю і песімізму, але як покліч да творчай і самаадданай працы, бо іншага шляху для пераадолення згаданых цяжкасцей проста не існуе.

---

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускай літаратуры / А. Адамовіч. – Мінск: Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.

3. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – Т. 2. – 600 с.

4. *Гарун, А.* Выбраныя творы / А. Гарун. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2003.– 448 с.

5. ***Hegel, G.W.F.*** Grundlinien der Philosophie des Rechts,oder Naturrecht und Staatswissenschaft im Grundrisse / G.W.F.Hegel; Hrsg. von Ed.Gans. – Berlin: Duncker und Humblot, 1833. – 440 S.

6. ***Heidegger, M.*** Sein und Zeit / M. Heidegger. – Tübingen: Niemeyer, 1993. – 445 S.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ